ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСИ
СТАЎБЦОЎСКІ РАЁННЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

праводзяць навукова-практычную канферэнцыю
«Стаўбцоўшчына – гісторыка-культурная спадчына Наднёманскага рэгіёна»

**Плануемае поле канферэнцыі:**

¬ Стоўбцы, Дзерэўная, Новы і Стары Свержань, Рубяжэвічы і ваколіцы паводле археалагічных крыніц;
¬ Стаўбцоўшчына ў часы Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай;
¬ развіццё Стаўбцоўшчыны ў XIX – XX стагоддзях;
¬ культурная спадчына Стаўбцоўшчыны (архітэктура, мастацтва, асвета, літаратура, этнаграфія і інш.);
¬ сельская гаспадарка, рамяство, гандаль, вытворчасць, шляхі зносін у гісторыі краю;
¬ славутыя імёны Стаўбцоўшчыны;
¬ ахова помнікаў культурнай спадчыны;
¬ выкарыстанне культурнай прасторы Стаўбцоўшчыны у сучасных умовах.

**Час правядзення канферэнцыі:** 27 кастрычніка 2016 г.
**Плануемае месца правядзення канферэнцыі** – г. Стоўбцы Мінскай вобл.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца да 1 верасня 2016 г.
У заяўцы паведамляецца імя, імя па бацьку і прозвішча дакладчыка, яго навуковая ступень і званне, назва даклада, назва ўстановы, якую прадстаўляе дакладчык, кантактны тэлефон, e-mail.
Аргкамітэт пакідае за сабой права адбору дакладаў для выступлення і публікацыі.
Пацвярджэнне аб удзеле ў канферэнцыі будзе даслана да 26 верасня 2016 г.
Матэрыялы канферэнцыі будуць апублікаваны. Патрабаванні да тэкстаў: аб'ём – не болей 40 000 знакаў, спасылкі пастаронкавыя, нумарацыя спасылак на кожнай старонцы. Першая спасылка на публікацыю даецца цалкам (аўтар, назва, месца і год выдання, старонкі), у наступнай спасылцы месца і год выдання не падаюцца.

Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі прымаюцца па электроннай пошце:
dounar_zagor@mail.ru
Кантакты: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1, Інстытут гісторыі НАН Беларусі.
Тэл. (+375 17) 284-14-09, факс (+375 17) 284-18-70. Доўнар Аляксандр Барысавіч,
e-mail: dounar_zagor@mail.ru
Харчаванне аплочваецца арганізатарамі канферэнцыі, праезд за кошт камандзіруючага боку.

**Рабочыя мовы канферэнцыі:** беларуская, руская, польская.